ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
14
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 28 (1366)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПЛЕНУМ

прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў абмеркаваў ход выканання пастановы XXV справаздачна-выбарчай прафсаюзнай канферэнцыі універсітэта і рэалізацыі крытычных заўваг, выказаных дэлегатамі на гэтай канферэнцыі. Разгледжана таксама пытанне аб дзейнасці народнага універсітэта «Прырода» і шляхах далейшага яе ўдасканалення.

**Я. СВІРСКІ,**
**член прафкома супрацоўнікаў.**

### ВЫСТАЎКА

«Беларуская ССР на міжнароднай арэне» была арганізавана навуковым абанементам бібліятэкі. Яе экспазіцыю склалі звыш 70 экземпляраў навуковай, вучэбнай і навукова-папулярнай літаратуры аб эканамічным, навуковым і культурным жыцці рэспублікі, аб сувязях БССР з краінамі сацыялістычнай садружнасці і іншымі краінамі свету.

Выстаўка выклікала цікавасць не толькі ў студэнтаў гістарычнага факультэта, у дапамогу якім была арганізавана, але і ў кожнага, хто цікавіцца сённяшнім днём рэспублікі.

**І. БАРДЗІЯН,**
**студэнтка журфака.**

### НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

пачала сваю работу на філалагічным факультэце. Яна прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння беларускіх песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. На пленарным пасяджэнні заслуханы даклады віцэ-прэзідэнта АН БССР, акадэміка І. Я. Навуменкі, кандыдата філалагічных навук, дацэнта М. Б. Яфімавай, загадчыка сектара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, доктара філалагічных навук М. І. Мушынскага, акадэміка АН БССР М. В. Бірылы, загадчыка кафедры беларускай літаратуры Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, прафесара А. А. Семяновіча і іншых вучоных і літаратуразнаўцаў, у якіх дакладчыкі спыніліся на жыцці і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, ролі пісьменнікаў у фарміраванні беларускай літаратурнай мовы, на месцы партыі і У. І. Леніна ў іх творчасці.

Заўтра удзельнікі канферэнцыі выступяць з паведамленнямі на пасяджэннях васьмі секцый. Завершыцца яна «круглым сталом», на які запрошаны беларускія крытыкі. Тут будуць разгледжаны праблемы сучаснага купалазнаўства і коласазнаўства.

**І. ШКРАБА,**
**выкладчык кафедры беларускай мовы.**



НОВАЯ ГРУПА замежных грамадзян папоўніла студэнцкую сям'ю нашага універсітэта. На першым часе іх галоўны клопат — вывучэнне мовы Леніна і Тургенева, Пушкіна і Талстога.

**НА ЗДЫМКУ: студэнты першага курса факультэта журналістыкі Гулгатані Нуры з Афганістана, Нгуен В'ет Тык з В'етнама, Ганна Нтабі Рантао з Афрыканскага кантынента паспяхова авалодваюць рускай мовай.**

Фота **В. Шачака.**

## ХАРЧОВАЯ ПРАГРАМА: НА ШЛЯХАХ РЭАЛІЗАЦЫІ

# ПА ПРАГРЭСІЎНАЙ ТЭХНАЛОГІІ

ПРАБЛЕМА распрацоўкі спосабаў павышэння пажыўнай каштоўнасці грубых кармоў з'яўляецца адной з важнейшых у народнай гаспадарцы. Асабліва вялікае значэнне надаецца паляпшэнню якасці саломы і больш шырокаму выкарыстанню яе ў кормавытворчасці.

Чаму пытанне стаіць іменна так? У Навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем БДУ імя У. І. Леніна нашу ўвагу звярнулі на такую лічбу: кожны год у нашай краіне вырабляецца каля 250 мільёнаў тон саломы, і толькі крыху менш палавіны ідзе на корм, у асноўным буйна-рагатай жывёле. Як вядома, каларыйнасць збожжа і саломы, па энергіі, якая ў ёй утрымліваецца, прыкладна аднолькавая. Аднак каэфіцыент выкарыстання саломы ў 5—6 разоў ніжэй. Гэта тлумачыцца перш за ўсё маладаступнасцю яе пажыўных кампанентаў. Таму павышэнне пажыўнай каштоўнасці гэтага корму, больш поўнае засваенне яго жывёлай з'яўляецца важнейшай задачай сучаснай кормавытворчасці, а салома — вялікім рэзервам павышэння эфектыўнасці жывёлагадоўлі.

Зараз у лабараторыі радыяцыйнай хіміі сумесна з Цэнтральным навукова-даследчым інстытутам механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі праводзяцца даследаванні па распрацоўцы радыяцыйнай тэхналогіі павышэння пажыўнасці кармоў, у прыватнасці, саломы. Папярэднія даследаванні паказалі, што апрацоўка іянізаванымі выпраменьваннямі прыводзіць да фізіка-хімічных змен: адбываецца распад палімернага ланцуга цэлюлозы і ўтвараюцца шматлікія асколачныя прадукты, сярод якіх шмат лёгказасваяльных цукраў. Дзякуючы гэтаму, корм значна лепш пераварваецца і засвойваецца жывёлай — харчовая каштоўнасць матэрыялаў павышаецца.

— У Навукова-даследчым інстытуце жывёлагадоўлі,—расказваюць выканаўцы эксперымента, — былі праведзены вопыты па вызначэнню харчовай каштоўнасці абпраменненай саломы на сельскагаспадарчых жывёлах. Заатэхнікі заўважылі, што жывёлы ахвотней паядалі апрацаваны такім метадам корм. Пасля заканчэння эксперымента ўстанавілі, што пажыўнасць саломы павялічылася ў паўтара раза і паднялася да ўзроўню лугавога сена.

Затраты на апрацоўку саломы іянізаванымі выпраменьваннямі, неабходныя для дасягнення ўказанага выніку, не перавышаюць 15 рублёў за тону, што амаль у два разы танней апрацоўкі саломы ўкаранёным у вытворчасць гідрабаратэрмічным спосабам.

Такім чынам, радыяцыйная апрацоўка саломы розных сельскагаспадарчых культур павышае іх засваяльнасць і таму можа рэкамендавацца як спосаб павышэння спажыўнасці грубых кармавых матэрыялаў. Сёння ў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ імя У. І. Леніна вядуцца даследаванні па вызначэнню аптымальных рэжымаў радыяцыйнай апрацоўкі грубых і камбінаваных кармоў, распрацоўваюцца тэхналагічныя асновы для шырокага ўкаранення ў вытворчасць. Думаецца, гэтым самым вучоныя інстытута ўнясуць значны ўклад у вырашэнне задач, пастаўленых Харчовай праграмай.

**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

# З мэтай каардынацыі

ДАСЛЕДАВАННІ па палітычнай эканоміі ў краіне каардынуюцца Навуковым саветам АН СССР па комплекснай праблеме «Эканамічныя заканамернасці развіцця сацыялізму і спаборніцтва дзвюх сістэм» цераз яго рэспубліканскія філіялы. З мэтай правядзення пасяджэння Беларускага філіяла дадзенага Навуковага савета ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна знаходзіліся старшыня Навуковага савета АН СССР акадэмік А. М. Румянцаў і вучоны сакратар савета кандыдат эканамічных навук К. І. Куроўскі. Акадэмік А. М. Румянцаў расказаў аб структуры Навуковага савета АН СССР. Ён падкрэсліў, што зараз галоўнай задачай з'яўляецца мабілізацыя ўсіх сіл акадэмічнай навукі і навукі ВНУ на вырашэнне фундаментальных праблем палітычнай эканоміі.

Затым быў зацверджаны персанальны састаў Беларускага філіяла Навуковага савета АН СССР па комплекснай праблеме «Эканамічныя заканамернасці развіцця сацыялізму і спаборніцтва дзвюх сістэм» у саставе трыццаці трох чалавек — вядомых у рэспубліцы вучоных-палітэканомаў. Выбрана бюро філіяла з адзінаццаці чалавек. Старшынёй Беларускага філіяла Навуковага савета АН СССР выбраны доктар эканамічных навук, прафесар С. Я. Янчанка — загадчык кафедры палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, вучоным сакратаром — кандыдат эканамічных навук Т. І. Адамовіч — в. а. дацэнта гэтай жа кафедры.

У час знаходжання ў нашым універсітэце акадэмік А. М. Румянцаў выступіў з лекцыямі перад членамі кафедраў палітычнай эканоміі БДУ, перад студэнтамі пятага курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта, перад слухачамі ІПК выкладчыкаў грамадскіх навук, адказаў на зададзеныя пытанні.

Выбар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ў якасці цэнтра Беларускага філіяла Навуковага савета АН СССР па комплекснай праблеме «Эканамічныя заканамернасці развіцця сацыялізму і спаборніцтва дзвюх сістэм» — сведчанне высокай адзнакі ўкладу палітэканомаў універсітэта ў развіццё фундаментальнай эканамічнай навукі.

**Наш кар.**

**На здымку:** выступае акадэмік **А. М. Румянцаў.**





# ВЫПАДКОВАСЦЬ АДКРЫЦЦЯ ЦІ АДКРЫЦЦЁ ВЫПАДКОВАСЦІ?

**ФАТАГРАФІЯ, «МАЛЮНАК СВЯТЛОМ».**

**БЕЗ ЯЕ МЫ ЎЖО НЕ ЎЯЎЛЯЕМ НАША ЖЫЦЦЁ.**

## ЗНАХОДКІ ВУЧОНЫХ

ГЛЯДЗІМ у альбом і бачым бабулю ў шлюбнай сукенцы і жаніха-дзядулю з ліха закручанымі вусамі, маладых бацькоў, пухлых немаўлят, у якіх з цяжкасцю пазнаём сябе. І ўсё гэта дзякуючы таму, што больш стапяцідзесяці гадоў назад была вынайдзена фатаграфія. З таго часу яна пастаянна развіваецца. Памочнікамі становяцца хімія, фізіка, матэматыка, біялогія.

Папулярнасць фатаграфіі — у яе прастаце. Калі ў пачатку стагоддзя, каб атрымаць партрэт, патрэбна было некалькі гадзін нерухома трымаць «аб'ект» перад аб'ектывам, то сёння амаль кожны школьнік з захапленнем здымае «Зоркім» ці «Зменай». І калі ласка, назаўтра ёсць даволі якасны здымак. За паўтара стагоддзя пройдзены шлях ад скрынкі з адтулінай, з грувасткай трыногай і магніевай успышкай, якая больш палохала, чым дапамагала, да аўтаматаў, якія перадаюць фатаграфіі з космасу. Але нязменным застаецца серабро, без яго солей немагчыма зрабіць фота. А серабро, як вядома, метал каштоўны, дарагі. Прыродныя запасы яго абмежаваныя.

Замену серабру шукаюць не першы год. Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем БДУ імя У. І. Леніна (узначальвае інстытут член-карэспандэнт АН БССР В. В. Свірыдаў—навуковы кіраўнік работ па бессярэбранай і маласярэбранай фатаграфіі) сумесна з Казанскім навукова-даследчым тэхналагічным і праектным інстытутам хімічна-фатаграфічнай прамысловасці працуюць над стварэннем фотаматэрыялаў, у якіх серабро ўтрымлівалася б у самых малых колькасцях або яго не было б зусім. І вось навіна—можна абысціся без серабра!

Даведаўшыся пра гэта, іду да намесніка дырэктара НДІ фізіка-хімічных праблем дацэнта Г. А. Браніцкага. Ён расказвае пра вынаходніцтва — маласярэбраны матэрыял:

**— Усё неяк нечакана выйшла: мы працавалі над здымкамі для патрэб тэхнікі. На такіх здымках пры памяншэнні ўтрымання серабра ў 10—40 разоў атрымліваецца слаба бачнае адлюстраванне. Затым у спецыяльным растворы на серабры асядае медзь або нікель, і адлюстраванне становіцца нармальным. Работа ішла паспяхова, і мы сталі рыхтаваць здымкі на выстаўку, думаючы, як лепш іх «падаць». І тут раптам заўважылі, што на новых матэрыялах, чорна-белых, атрымліваецца шматколернае адлюстраванне з вялікай выразнасцю ўсіх элементаў.**

Выпадковая знаходка... Яна, зразумела, магчыма ў рабоце вучонага... Але ці можна гаварыць аб выпадковасці, калі праблемамі маласярэбранай фатаграфіі лабараторыя хіміі фатаграфічных працэсаў, якой кіруе Генадзій Аляксеевіч, займаецца ўжо не першы год. Гэта была заканамерная, калі можна так сказаць, «чаканая» выпадковасць. Так дацэнт Г. А. Браніцкі і яго калегі — старшыя навуковыя супрацоўнікі В. Д. Сташонак і Л. П. Рогач сталі аўтарамі новага перспектыўнага вынаходніцтва.

Лабараторыя. На першы погляд — звычайнае пяча-



# ВУЧЫЦЬ І ВУЧЫЦЦА ПА-ЛЕНІНСКУ

**Нядаўна адбылося пасяджэнне Савета БДУ імя У. І. Леніна, на якім з дакладам «Вынікі 1981—1982 навучальнага года і задачы калектыву універсітэта па далейшаму павышэнню якасці і эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС» выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Я. П. ПЯТРАЕЎ. Сёння газета змяшчае даклад у скарачэнні.**

ШМАТТЫСЯЧНЫ калектыў універсітэта, як і ўвесь савецкі народ, працуе сёння пад знакам сустрэчы слаўнага юбілею — 60-годдзя ўтварэння СССР, выконваючы грандыёзныя задачы камуністычнага будаўніцтва, якія паставіў XXVI з'езд КПСС. Шырокі водгук выклікала ва універсітэце Харчовая праграма, адобраная майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС, накіраваная на далейшае павышэнне дабрабыту савецкага народа. Ажыццявіць рашэнні партыі і ўрада, забяспечыць павышэнне ролі вышэйшай школы ў сацыяльна-эканамічным і навукова-тэхнічным прагрэсе савецкага грамадства — вось задачы, што стаяць сёння перад калектывам універсітэта.

Кадры, якія рыхтуе універсітэт, будуць выконваць задачы заўтрашняга дня, таму мы павінны прадугледзець у іх падрыхтоўцы комплекс навыкаў, якія забяспечваюць творчы патэнцыял і дзелавыя якасці будучага спецыяліста. Сярод іх самым важным, відаць, з'яўляецца імкненне да пастаяннага назапашвання ведаў, здольнасць да абагульненняў у пошуках канструктыўных рашэнняў, смеласць і самаадданасць у вырашэнні ўзнікаючых праблем.

«Глыбока, у поўным аб'ёме авалодваць праграмным матэрыялам ВНУ,— указваў Л. І. Брэжнеў у прамове на Усесаюзным злёце студэнтаў, — важна, цалкам неабходна. Але аднаго гэтага не дастаткова. Патрэбна навучыцца пастаянна ўдасканальваць свае веды, выпрацоўваць навыкі даследчыка, шырокі творчы кругагляд».

Рашэнне гэтых задач у многім вызначаецца зладжанымі дзеяннямі тых, ад каго залежыць вучэбна-выхаваўчы працэс, ад таго, наколькі наша актыўнасць у галіне навукова-метадычнага кіраўніцтва і нашы сумесныя намаганні будуць сканцэнтраваны на адной мэце, абраныя метады і сродкі — узаемаўзгодненымі. Гэтай адзінай мэтай і з'яўляецца паляпшэнне тэарэтычнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Для ўдасканальвання выкладання вучэбных курсаў і камуністычнага выхавання студэнтаў у БДУ імя У. І. Леніна нямала зроблена за апошнія гады. Актывізавана ўкараненне ў вучэбны працэс новых метадаў і сродкаў навучання, наладжана сістэматычнае павышэнне педагагічнай і навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў, істотна палепшылася забяспечанасць вучэбна-метадычнымі матэрыяламі, літаратурай. Усё гэта станоўча адбіваецца на ўзроўні тэарэтычных ведаў і практычнага ўмення студэнтаў, на іх агульнай і спецыяльнай падрыхтоўцы. Трэба адзначыць, што ў цэлым выпускнікі універсітэта паспяхова працуюць на заводах, у навукова-даследчых арганізацыях і вучэбных установах рэспублікі. За вялікі ўклад у падрыхтоўку спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі краіны і ў сувязі з шасцідзесяцігадовым юбілеем БДУ імя У. І. Леніна быў узнагароджаны Ганаровай Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Аднак недаравальнай памылкай было б спыніцца толькі на дасягнутым, пакінуць па-за ўвагай тыя пытанні, што яшчэ устаюць перад калектывам універсітэта, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. А гэта, у першую чаргу, павышэнне паспяховасці студэнтаў, набыццё імі цвёрдых ведаў па розных вучэбных дысцыплінах. Па выніках мінулага вучэбнага года найлепшых паказчыкаў у гэтым плане на дзённай форме навучання дасягнулі геаграфічны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі, гістарычны факультэт. Павысілася паспяховасць на механіка-матэматычным факультэце. Сярод вячэрнікаў найбольш трывалыя веды паказалі студэнты геаграфічнага, механіка-матэматычнага і юрыдычнага факультэтаў. Узрасла паспяховасць студэнтаў-завочнікаў таго ж геаграфічнага, юрыдычнага факультэтаў.

Але праблема павышэння паспяховасці яшчэ востра стаіць перад калектывам універсітэта. Найбольш нізкія якасныя паказчыкі на ўсіх формах навучання назіраліся на фізічным, філалагічным факультэтах і факультэце журналістыкі. На жаль, у рабоце дэканатаў і кафедраў гэтых факультэтаў сустракаюцца значныя прабелы, што, відавочна, адбіваецца на паспяховасці студэнтаў.

Дзень сённяшні патрабуе ад факультэтаў, кафедраў і лабараторый, ад кожнага выкладчыка, лабаранта і метадыста накіраваць усе свае веды і сілы на павышэнне ў студэнтаў адказнасці за вучобу, актывізацыю іх творчай дзейнасці. З гэтай мэтай неабходна дабівацца паляпшэння якасці лекцый — вядучай формы навучання, практычных, семінарскіх, лабараторных заняткаў, самастойнай работы студэнтаў.

Калі прааналізаваць вынікі здачы дзяржаўных экзаменаў, то нельга не заўважыць, што найбольшую колькасць дыпломаў з адзнакай атрымалі студэнты біялагічнага, гістарычнага, механіка-матэматычнага, юрыдычнага, факультэта радыёфізікі і электронікі. У вячэрнікаў лепшых вынікаў дасягнулі біёлагі, хімікі, філолагі, географы, а ў завочнікаў — факультэт журналістыкі, філалагічны, біялагічны, гістарычны і геаграфічны факультэты.

Дыпломныя работы ў сваёй большасці выкананы па рэальнай тэматыцы, адпавядаюць сучаснаму ўзроўню развіцця навукі, тэхнікі, культуры, вытворчасці і прадстаўляюць практычную каштоўнасць.

1002 дыпломныя работы або 36,6 працэнта Дзяржаўнымі экзаменацыйнымі камісіямі рэкамендаваны да друку ці ўкаранення ў вытворчасць, што сведчыць аб іх высокай якасці і актуальнасці тэматыкі.

Найбольшая колькасць такіх работ налічваецца на факультэце прыкладной матэматыкі — 73,6 працэнта. Гэтыя работы цесна звязаны з тэмамі навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх работ НДІ ЭВМ, Інстытута матэматыкі АН БССР, Інстытута тэхнічнай кібернетыкі АН БССР і іншых арганізацый сталіцы і рэспублікі і прысвечаны праблемам тэорыі распрацоўкі праграмнага і матэматычнага забеспячэння і іх эфектыўнага выкарыстання для рашэння народнагаспадарчых задач XI пяцігодкі.

Каля 60 працэнтаў дыпломных работ выпускнікоў механіка-матэматычнага факультэта рэкамендавана да ўкаранення. Іх напрамак — далейшае развіццё праграмнага забеспячэння ЭВМ трэцяга пакалення. Многія дыпломныя работы



танне фатаграфій. Але гэта толькі на першы погляд. Замест плёнкі ў павелічальнік устаўляюць слайд, замест бумагі — новы фотаматэрыял. А далейшае недасведчанаму чалавеку можа паказацца проста фокусам. Пасля экспаніравання здымак апускаецца ў раствор для апрацоўкі і праз 15—20 секунд можна ўключаць святло — далейшы працэс не патрабуе цемнаты. Яшчэ праз 40—50 секунд фатаграфія гатова. Яе засталося прамыць і прасушыць. Раствор замяняе і праявіцель, і фіксаж і захоўвацца можа каля двух месяцаў, што, вядома, вельмі зручна.

Але самая большая нечаканасць — з чорна-белага слайда атрымліваецца афарбаванае адлюстраванне. Яно не каляровае ў поўным сэнсе гэтага слова, а хутчэй шматкаляровае, або, як тут гавораць, поліхромнае. Хоць у састаў матэрыяла і ў апрацоўваючыя растворы не ўваходзяць афарбоўваючыя кампаненты, каляровая гама фотаздымка блізкая да каляровай гамы здымаемага аб'екта. Адценні колераў рэгулююцца саставам раствораў для апрацоўкі, яго тэмпературай і часам экспаноўкі.

І вось я трымаю ў руках гатовыя здымкі. У асноўным гэта пейзажы, відавыя фатаграфіі. Цудоўнае па выразнасці адлюстраванне, удала падабраныя колеры — наўрад тут мог бы да чаго-небудзь прыдрацца самы строгі крытык.

**— Як бачыце, у маласярэбраных фотаматэрыялах шмат вартасцей. Яны эканамічныя, таму што ўтрымліваюць малую колькасць серабра. Тэхналогія іх вытворчасці ўжо адпрацавана. Пры доўгім захаванні якасці іх не змяняюцца. Адлюстраванне атрымліваецца як з чорна-белых, так і з каляровых пазітываў. Апрацоўваючы раствор утрымлівае недарагія кампаненты, што выпускаюцца прамысловасцю. Працэс атрымання адлюстравання просты і праходзіць вельмі хутка. Думаецца, што прамысловасць зацікавіцца навінкай, — гэтымі словамі Г. А. Браніцкі закончыў расказ пра работу сваёй лабараторыі.**

Перавагі новага фотаматэрыялу бясспрэчны. Маласярэбраныя фотаматэрыялы могуць выкарыстоўвацца ў астраноміі, прыладабудаванні, мікрафільміраванні, паліграфіі, картаграфіі, пры правядзенні судовых экспертыз. Ну і, вядома, у мастацкай фатаграфіі.

А ў лабараторыі працягваецца работа. Пажадаем яе супрацоўнікам больш такіх «выпадковасцей».

В. САРОКІНА.

**НА ЗДЫМКАХ:** гэты эцюд зроблены на чорна-белай фотаплёнцы з шматкратным паменшэннем ўтрымання серабра і можа мець разнастайныя каляровыя адценні; Г. А. БРАНІЦКІ і В. В. СВІРЫДАЎ за абмеркаваннем вынікаў чарговага эксперымента; супрацоўнікі лабараторыі даследуюць новы метад атрымання фатаграфіі.

Фота **В. Шачака.**

● СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў ПРАФСАЮЗАХ ●

# Клопаты пярвічнай

**У ПЯРВІЧНЫХ прафсаюзных арганізацыях універсітэта ідуць справаздачна-выбарчыя сходы. Справаздачы — гэта заўсёды і падвядзенне вынікаў, і абмен станоўчым вопытам, і крытыка недахопаў. У полі зроку прафсаюзаў — вучэбна-навуковая, вытворчая, ідэйна-выхаваўчая, культурна-масавая работа. Сярод праблем, якія абмяркоўваюцца на сходах, у цэнтры ўвагі стаяць пытанні аховы працы, паляпшэння жыллёва-бытавых умоў супрацоўнікаў і выкладчыкаў, удасканалення эстэтыкі і культуры вытворчасці, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Пра тое, як праходзіў справаздачна-выбарчы сход прафсаюзнай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў гістарычнага факультэта, расказ нашага карэспандэнта.**

СТАРШЫНЯ прафсаюзнага бюро факультэта, загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў Н. І. Гусякова ў справаздачным дакладзе расказала пра дзейнасць камісій прафбюро, адзначыла дасягненні і недахопы, выказала пажаданні наступнаму саставу прафсаюзнага бюро. Асаблівая ўвага звярталася на работу вучэбна-навуковай і вытворча-масавай камісій, на арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва сярод кафедраў, забеспячэнне публічнасці ў ходзе спаборніцтва. Неабходнасць такой інфармацыі пацвердзілі праверкі, якія праводзіліся членамі прафбюро. Высветлілася, што многія даныя пра ход сацыялістычнага спаборніцтва былі завышаныя. Для стварэння аб'ектыўнага ўяўлення аб выніках спаборніцтва патрабуюцца дакладныя, рэальныя даныя, гэта значыць, што арганізацыя кантролю за сацыялістычным спаборніцтвам— задача прафсаюзнага бюро факультэта.

Нягледзячы на тое, што не ўсе запланаваныя мерапрыемствы былі выкананы, дзейнасць культурна-масавай камісіі заслугоўвае добрага слова. Адбыліся вечары адпачынку выкладчыкаў і студэнтаў, урачыста прайшоў і вечар, прысвечаны 60-годдзю БДУ, запомнілася і падарожжа ў сталіцу Арменіі—Ерэван.

На працягу мінулага навучальнага года на пасяджэннях прафбюро ішла гаворка пра навуковыя даследаванні на факультэтах, працоўную дысцыпліну, летні адпачынак і іншыя. Прайшла — на жаль, толькі адна — вытворчая нарада, дзе абмяркоўваліся шляхі павышэння ўзроўню вучэбна-выхаваўчай і навуковай работы.

Увогуле справаздачны даклад сведчыць аб тым, што прафсаюзная арганізацыя гістарычнага факультэта дасягнула пэўных станоўчых вынікаў у развіцці грамадскіх форм работы, правядзенні палітыка-выхаваўчых, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў. Гэта адзначалі тыя, хто выступаў у абмеркаванні даклада. М. П. Баранава, дацэнт прапанавала будучаму саставу прафбюро звярнуць асаблівую ўвагу на вывучэнне вопыту работы кафедры гісторыі БССР, якая заўсёды з'яўляецца правафланговым сацыялістычнага спаборніцтва. У. Ф. Беркаў — сакратар партыйнага бюро факультэта выказаў заклапочанасць аб належнай арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва за прысваенне звання «Ударнік камуністычнай працы». У ліку прапаноў — і парада культурна-масавай камісіі: важна не толькі займацца арганізацыяй вольнага часу супрацоўнікаў і выкладчыкаў, але і актыўней далучаць іх да калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта.

Прафесар кафедры гісторыі новага і навейшага часу Р. М. Трухноў прыкмеціў, што прафбюро трэба ўважлівей адносіцца да патрэб ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, забяспечваць іх пуцёўкамі ў лепшыя здраўніцы,назіраць за тым, каб былыя воіны адпачывалі ў добрых умовах.

Пасля абмеркавання даклада сход пастанавіў прызнаць работу прафбюро здавальняючай, а новаму саставу наказаў мабілізаваць калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта на пасляховую сустрэчу юбілею Радзімы, патрабаваў удасканаліць методыку падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, распрацаваць неабходныя мерапрыемствы па арганізацыі культурна-масавай і спартыўнай работы на факультэце, рэгулярна рыхтаваць і праводзіць вытворчыя нарады, дакладна каардынаваць сваю дзейнасць з партыйным бюро факультэта, дэканатам і іншымі грамадскімі арганізацыямі.

**Н. НАДЗЕЖДЗІНА,**
**наш кар.**

з'яўляюцца закончанымі праектамі, яны даведзены да практычнага выкарыстання і ў хуткім часе будуць уключаны ў буйныя праграмныя комплексы для прамысловай эксплуатацыі.

Высокай адзнакі заслугоўваюць некаторыя дыпломныя работы студэнтаў фізічнага факультэта. Шэраг даследаванняў выпускнікоў кафедры біяфізікі Л. Галоднева, Н. Дзімідзік, А. Юркевіча быў прысвечаны практычным распрацоўкам кафедры, накіраваным на выкананне Харчовай праграмы.

Абарона дыпломных работ паказала, што большасць студэнтаў валодае навыкамі самастойнай навуковай работы, уменнем аналізаваць літаратуру па абранай тэме і дастаткова пераканаўча аргументаваць вывады і палажэнні.

Разам з гэтым не можа не хвалявацць той факт, што ў выпускнікоў гістарычнага, фізічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў і факультэта радыёфізікі і электронікі назіраюцца недахопы ў ведах агульных фундаментальных дысцыплін. Патрэбна, каб гэтыя пытанні былі дэталёва абмеркаваны на факультэтах і кафедрах, метадычных саветах.

Хочацца спыніцца на засваенні студэнтамі грамадскіх навук, якія фарміруюць у савецкай моладзі камуністычныя адносіны да працы, глыбокую ідэйную перакананасць.

На дзяржаўных экзаменах большасць выпускнікоў паказалі трывалыя веды не толькі вучэбнай праграмы, але таксама прац класікаў марксізму-ленінізму, відных дзеячаў камуністычнага і рабочага руху, Праграмы КПСС, матэрыялаў XXVI з'езда КПСС, дакументаў міжнародных Нарад камуністычных і рабочых партый, іншых важнейшых крыніц навуковага камунізму. Студэнты ўмела спалучалі тэарэтычныя палажэнні з сучаснасцю, з важнейшымі палітычнымі падзеямі як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне.

Аднак вынікі дзяржаўных экзаменаў сведчаць і аб тым, што кафедры грамадскіх навук яшчэ не ў поўную меру выкарыстоўваюць усе магчымасці для павышэння якасці ведаў студэнтаў. Прафесарска-выкладчыцкаму саставу пры чытанні лекцый, правядзенні семінарскіх заняткаў і кансультацый неабходна больш увагі ўдзяляць развіццю творчага самастойнага мыслення студэнтаў, больш глыбокаму разуменню сучасных сацыяльных праблем, праблем камуністычнага выхавання і фарміравання асобы, накіроўваць намаганні студэнтаў на фундаментальнае вывучэнне твораў заснавальнікаў навуковага камунізму, матэрыялаў па пытаннях расколу ў міжнародным рабочым руху.

Падрыхтаваць высокаадукаванага спецыяліста без далучэння яго ў час вучобы ў ВНУ да навукова-тэхнічнай творчасці, немагчыма. Таму намаганні калектыву БДУ павінны быць накіраваны на ўсямернае ўдасканаленне даследчай работы студэнтаў, на пошук новых шляхоў яе развіцця, на тое, каб удзел кожнага з іх у даследчай рабоце стаў абавязковай састаўной часткай вучэбнага працэсу.

У 1981—1982 навучальным годзе ўсімі формамі НДРС было ахоплена каля 79 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання. З вынікамі сваёй навуковай работы студэнты выступаюць на універсітэцкіх канферэнцыях. Так, у мінулым вучэбным годзе імі было прачытана каля 3300 дакладаў. Шмат студэнтаў выступілі з навуковымі дакладамі на канферэнцыях у іншых ВНУ краіны, на рэспубліканскіх і Усесаюзных канферэнцыях.

220 студэнтаў прынялі ўдзел у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе студэнцкіх навуковых работ па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, з іх палавіна была адзначана дыпломамі Беларускага рэспубліканскага савета НДРС, і 24 — дыпломамі і грашовымі прэміямі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Беларускіх навукова-тэхнічных таварыстваў.

44 студэнцкія навуковыя работы рэкамендаваны на рэспубліканскі тур конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, многія з іх былі ўзнагароджаны дыпломамі МінВНУ БССР.

За гэты ж перыяд больш дваццаці студэнтаў сталі саўтарамі вынаходніцтваў. 262 студэнты надрукавалі вынікі сваёй НДР у саўтарстве з выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі універсітэта.

Аднак гэтыя паказчыкі былі б значна вышэйшымі, калі б кафедры сур'ёзней ставіліся да навукова-даследчай работы студэнтаў, факультэты больш увагі ўдзялялі развіццю НДРС.

Далейшае прымяненне павінна знайсці ва універсітэце такая форма педагагічнай дзейнасці, як прыцягненне да выкладання на факультэтах вядучых вучоных і спецыялістаў акадэмічных інстытутаў, спецыялістаў, якія непасрэдна заняты ў вытворчасці і знаходзяцца, як кажуць, на пярэдніх рубяжах навукі.

Галоўная задача вышэйшай школы — вучыць студэнтаў самастойна авалодваць ведамі, развіваць у іх творчае мысленне. Яшчэ У. І. Ленін падкрэсліваў: «Без вядомай самастойнай працы ні ў адным сур'ёзным пытанні ісціны не знайсці, і хто баіцца працы, той сам сябе пазбаўляе магчымасці знайсці ісціну». Таму важным аспектам дзейнасці выкладчыкаў з'яўляецца развіццё творчых якасцей студэнцкай моладзі, выхаванне ў будучых спецыялістаў культуры самаадукацыі. Аднак гэтай работай кафедры і факультэты яшчэ займаюцца недастаткова.

Значнае месца ў павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў надаецца распрацоўцы метадычных рэкамендацый, указанняў па тых ці іншых курсах і спецкурсах, а таксама інструкцый да лабараторных і практычных работ. Аднак не ўсе факультэты сур'ёзна падыходзяць да распрацоўкі гэтых выданняў. Справа ў тым, што кантроль з боку дэканаў, загадчыкаў кафедраў, вучэбна-метадычных камісій за ходам распрацовак слаба ажыццяўляецца.

Вялікая работа праведзена вучонымі універсітэта па падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ВНУ і сярэдніх школ. Складаныя задачы па далейшаму ўдасканаленню зместу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў стаяць перад намі ў святле пастановы ЦК КПСС аб вышэйшай школе. Пытанні павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, неабходнасць пастаяннай самаадукацыі і павышэння кваліфікацыі патрабуюць стварэння перш за ўсё універсальных падручнікаў.

Важнай падзеяй у развіцці метадычнай работы стала універсітэцкая навукова-метадычная канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю БДУ імя У. І. Леніна. У ёй прыняла ўдзел вялікая частка прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта. Распрацаваныя на канферэнцыі рэкамендацыі, іх укараненне паслужаць далейшаму ўдасканаленню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на праблемы камуністычнага выхавання студэнтаў. У наш складаны час, калі ідзе жорсткая барацьба паміж дзвюма ідэалогіямі, калі імперыялісты і іх паслугачы, жадаючы спыніць непераможны працэс гістарычнага развіцця, вядуць наступленне на сацыялізм, на справу міру і сацыялізму, ідэалагічная работа ва універсітэце становіцца асабліва важнай.

Жыццё настойліва патрабуе ад кожнага з нас паглыблення і ўдасканалення вучэбнай і ідэйна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Карацей кажучы, вучыць і вучыцца па-ленінску. Толькі ў гэтым — аснова далейшага росту ролі і аўтарытэту БДУ імя У. І. Леніна — флагмана вышэйшай школы рэспублікі.

АГЛЯД ПАЭТЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ

# «УЗЛЁТАЎЦЫ» ПІШУЦЬ ПРА СЯБЕ

КОРПУС ФІЛАЛАГІЧНАГА факультэта. Падымаюся на другі паверх, спыняюся ля адной з аўдыторый, адкуль чуваць натхнёныя галасы студэнтаў — ідзе чарговае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт», якім кіруе прафесар Алег Антонавіч Лойка.

«Узлётаўцы»... Гэтае слова ўпершыню прагучала васемнаццаць гадоў назад. «Узлётаўцаў» чулі на шматлікіх вечарах паэзіі, іх вершы гучалі па радыё, друкаваліся ў рэспубліканскіх выданнях, «Беларускім універсітэце». Аб чым яны? Ды аб усім, што блізка юначым сэрцам: аб Радзіме, сінявокай Беларусі, аб маці і зямлі, дзе нарадзіўся і рос. Многія вершы прысвечаны «студэнцкай» тэме. Яна якраз і складае галоўную частку ўсіх пяці паэтычных выданняў «узлётаўцаў», што ўбачылі свет — зборнікаў «Падарунак», «Узлёт», «Натхненне», «Універсітэт паэтычны» і «Вёсны».

Першы зборнік — «Падарунак» — выйшаў з друку ў 1958 годзе пад рэдакцыяй М. Ларчанкі. Прадмову да кнігі напісаў Іван Навуменка, які ў той час кіраваў літаратурным гуртком. У «Падарунак» увайшлі творы 25 аўтараў, і амаль у кожнага ёсць вершы пра студэнцкае жыццё.

Студэнцкія знаёмствы. Яны адбываюцца перш за ўсё восенню ў падшэфным калгасе. Там студэнты не толькі працуюць, але добрай песняй і шчырым словам радуюць калгаснікаў, таму і не дзіва, што едуць юнакі і дзяўчаты на «бульбу» з ахвотай. Аб гэтым добра напісаў паэт Уладзіслаў Нядзведскі, вершамі якога адкрываецца зборнік:

Пыл услед — нібы лента,
Вецер свішча ў вушах.
Ці ў далёкі, студэнты,
Вы сабраліся шлях?
А з машыны ў адказ:
— У падшэфны калгас!

«Дзяўчына з хімфака», «Вяселле ў інтэрнаце», «Пасылка», «Агні інтэрната» — гэта вершы паэта Ніла Гілевіча. Яны простыя і зразумелыя, праўдзівыя і цікавыя ўсім, каму пашчасціла займацца ва універсітэце. А калі чытаеш вершы «Вяселле ў інтэрнаце» і «Пасылка», на твары адразу з'яўляецца ўсмешка:

Прыйшла яна вельмі дарэчы,
Як зналі бацькі ўсё адно:
Стыпендыя выйшла дарэшты,
А новай яшчэ не чутно.

А Васіль Зуёнак напісаў пра студэнцкі чамадан, у якім чаго толькі няма. Тут і кніжка Купалы, і томік Бальзака, і нават студэнцкі буфет:

Тут буфет студэнцкі мой,
паколькі
Без яго не пражывеш ніяк.

Паэт сур'ёзна заяўляе, што «чамадан мне — як курцу кісет», ён яго ў жыцці не прамяняе нават «на бляск пузатых чамаданаў».

Рыгор Барадулін прысвяціў свой верш роднаму інтэрнату, дзе «па вечарах дыскусія кіпіць і чайнік, выцегнуўшы шыю, нібы гусак, разгневана шыпіць».

У 1965 годзе выходзіць новы зборнік вершаў «Узлёт». Склаў яго сённяшні кіраўнік літаб'яднання паэт Алег Лойка. У адрозненне ад першай кніжкі, вершы на «студэнцкую» тэму «Узлёта» выдзяляюцца душэўным сумам па роднай вёсцы, па тых мясцінах, дзе прайшлі дзіцячыя і школьныя гады:

Хутка ў поезд сяду —
І ў сяло мурожнае:
Засталася ззаду
Сесія трывожная.
Ціхі сад з аскомай
І бары з чарніцамі
Хутка стануць дома
Лепшымі бальніцамі, —

піша Мікола Маляўка. А многія паэтычныя творы напоўнены гумарам і весялосцю, без чаго не можа жыць сапраўдны студэнт. Пятро Сушко піша аб гэтым з вялікім запалам і даволі дасціпна. Вось некалькі радкоў з вершаў «Перад экзаменам» і «Студэнцкая жартоўная»:

...Ні пуха яму,
Ні пяра!
Ні двойкі мне,
Ні кала!

***

Павячэрае
Ды паснедае.
І бывай твая
Уся стыпендыя...

Праз два гады пасля «Узлёта» з друку выходзіць новая кніжка «Натхненне». З яе хочацца выдзеліць вершы Генадзя Дзмітрыева, Алены Руцкай і Алеся Камароўскага. Генадзь Дзмітрыеў надзвычай тонка адчувае жыццё студэнтаў. Ён хораша напісаў пра тое, як студэнты ўсім курсам адзначалі імяніны старасты, а Алена Руцкая і Алесь Камароўскі ўсхвалявана апяваюць рамантычныя будні інтэрната, у сваіх паэтычных радках яны ўспамінаюць пра бацькоўскі дом, як «лічаць дні да ад'езду дамоў».

«Універсітэт паэтычны» — гэта чацвёртая па ліку кніга вершаў студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна, які за гады свайго існавання стаў сапраўды універсітэтам паэтычным, даў беларускай савецкай паэзіі не адно пакаленне паэтаў. У гэты зборнік увайшлі вершы і тых аўтараў, якія сёння сталі вядомымі празаікамі і драматургамі, літаратуразнаўцамі і крытыкамі.

Зборнік «Універсітэт паэтычны» адкрываецца прадмовай Якуба Коласа «Сябрам-студэнтам». «Мой запавет вам: ідзіце ў нагу з жыццём, не закапайце ў зямлю вашых дараў, а прымнажайце і аддайце іх народу, Камуністычнай партыі, якія росцяць і выхоўваюць вас», — зычыць маладым паэтам беларускі песняр.

Пра клапатлівае і вясёлае жыццё студэнтаў расказалі ў гэтым зборніку Сяргей Дарожны, Мікола Аўрамчык, Іван Курбека, Мікола Арочка, Янка Сіпакоў і многія іншыя. А свой верш «Пасляваенны студэнт» Уладзімір Шахавец прысвяціў студэнтам фізмата:

Ляжаў ён у траншэях пад
замежным ветрам,
Прайшоў далін бязмежнасць
і прасёлкаў гразь;
Як сведка гэтага,
на гімнасцёрцы спектрам
Палоскі каляровыя гараць.

У 1977 годзе на прылаўках кніжных магазінаў з'явіўся невялікі блакітны зборнічак з прыгожаю назваю «Вёсны». Адгарнуўшы першую старонку, мы чытаем: «Вершы членаў літаб'яднання «Узлёт».

Я — камсамолка!..
І радасцю гордай
З небам высокім дзяліюся,
з зямлёй.
Ім гавару я ўпэўнена,
цвёрда:
Я — камсамолка!
Здаволены мной?.. —

гэтыя, поўныя энергіі і маладога запалу, радкі належаць Вользе Русілцы. Яна і адкрывае ўзлётаўскія «Вёсны», у якіх выступаюць з вершамі даволі маладыя аўтары. Але іх паэзія сур'ёзная і змястоўная, студэнты вядуць шчырую гаворку з нашым сучаснікам, якому, як і самім паэтам, выпала шчасце дбаць пра нашу будучыню.

Пра вячэрніцу універсітэта добра напісаў Алесь Пісарык, пра маці, якая хвалюецца за навуку свайго сына-студэнта, расказаў у вершы «Маці» Уладзімір Марук, пра чыстае і светлае пачуццё — студэнцкае каханне напісалі Віктар Стрыжак і Мікола Мятліцкі...

Ідуць гады... Ва універсітэт прыходзяць усё новыя таленавітыя юнакі і дзяўчаты, якія ўліваюцца ў паэтычную сям'ю «узлётаўцаў». А з цягам часу яны таксама раскажуць пра сябе, пра сваю вучобу і родны універсітэт.

**Сяргей ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака.**

З НАШАЙ ПОШТЫ

# ПЕРШАЯ «БУЛЬБА»

КОЖНЫ ГОД студэнты адпраўляюцца на сельгасработы ў розныя куткі Беларусі. «Мы едзем на «бульбу»!—у словах гэтых і прадчуванне чагосьці незвычайнага, і цёплыя вераснёўскія ночы, і духмяны пах парнога малака, і праца з жартамі і песнямі, таму што студэнты — народ вясёлы, яны ўжо па натуры сваёй рамантыкі.

А ўявіце сябе, як чакалі сваёй першай «бульбы» тыя, хто яшчэ зусім нядаўна хваляваўся на ўступных экзаменах, — першакурснікі. Для іх гэта магчымасць выпрабаваць сябе ў працы, знайсці сяброў і... адпачыць. Так, так, адпачыць ад падручнікаў і экзаменаў, турбот і хваляванняў, звязаных з паступленнем ва універсітэт. Да таго ж, кожны ведае, што першая «бульба» — гэта і першае каханне, першы касцёр знаёмства, агульныя песні, танцы...

А як праца? Безумоўна, не ўсё добра атрымлівалася. Вы думаеце, лёгка гараджаніну прыходзіцца на першым часе ў вёсцы? Спачатку брыгадзір нават дакарала памочнікаў, што не вельмі ж паладзілі яны з ільном. Але хутка ўжо жартавала, што сялянскія хлопцы цяпер могуць смела жаніцца з дзяўчатамі-мінчанкамі: такія снапочкі навучыліся рабіць — заглядзенне.

У жыцці шмат чаго трэба ўмець рабіць. Такія паездкі ў калгас карысныя і самім студэнтам. Яны вяртаюцца дамоў пасталеўшымі, падужэўшымі, не баяцца ўжо ні халоднага восеньскага ветру, ні калючага непрыемнага дажджу. «Бульба» — выдатная школа, бо тут на кожным кроку студэнтам трэба праяўляць сваю самастойнасць. І, зразумела, цяжэй тут прыходзіцца тым, хто любіць сядзець пад цёплым бацькоўскім крыльцам, хто не ведае, што такое турысцкі шматдзённы паход, які так нагадвае наша «бульба».

Але галоўны навык, які атрымліваюць першакурснікі, — гэта ўменне сябраваць. Спытайце любога біяфакаўца, што найбольш жаданае на «бульбе», адказ будзе адзін — дружба!

**В. СКРЫПКА,**
**студэнтка першага курса біяфака.**

# НЯМА АДСТАЮЧЫХ

НЯМА АДСТАЮЧЫХ сярод студэнтаў фізічнага факультэта, што працуюць у Быхаўскім раёне. 380 юнакоў і дзяўчат капаюць бульбу, ачышчаюць і сартуюць на таках збожжа, звозяць на калгасныя двары салому. У ліку правафланговых — байцы ССГА «Рэвалюцыя». На атрадным зборы яны прынялі зварот да ўсіх ССГА раёна, у якім заклікалі студэнтаў узяць павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР, унесці пасільны ўклад у рэалізацыю Харчовай праграмы. Самі рабяты імкнуцца пацвердзіць свае словы канкрэтнай працай: ачысціць і давесці да пасяўных кандыцый першага класа 650 тон насення азімых і яравых, адсартыраваць 1.800 тон бульбы, з іх 850 тон затарыць у мяшкі, выкапаць бульбу на плошчы ў 200 гектараў... Працоўны дагавор паспяхова выконваецца.

Аднак не толькі на полі і калгасным таку працуюць байцы студэнцкіх атрадаў. Вечарамі яны выступаюць з канцэртамі перад вяскоўцамі, чытаюць для іх лекцыі, палітінфармацыі, аказваюць дапамогу ветэранам вайны і працы. Не забываюць і аб сваіх падшэфных — школьніках. Студэнты афармляюць класы і кабінеты фізікі, рамантуюць прылады. А нядаўна ў раённым Доме культуры яны паказалі для вучняў старэйшых класаў, будучых абітурыентаў, фільм «Добры дзень, універсітэт!»

Па-ўдарнаму працаваць, цікава і карысна адпачываць — вось дэвіз студэнтаў фізічнага факультэта.

**Я. УШАКОЎ,**
**намеснік дэкана фізфака.**



**Студэнткі-першакурсніцы журфака на ўборцы льну ў калгасе «Серп і молат» Клімавіцкага раёна.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

14 кастрычніка 1982 г.
Зак. 1811. АТ 21511.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.